# «МОЛАДЗЬ І ТВОРЧАСЦЬ – ГІСТОРЫЯ БУДУЧАГА»









На здымках: падчас выступлення машэраўцаў.
Фота В. ЛУЗГІНОЙ.

Пад такім дэвізам праходзіў другі этап рэспубліканскага агляду-конкурсу мастацкай творчасці студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі «АРТ-вакацыі – 2018». У актавай зале Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта сабралася каля 500 студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў чатырох віцебскіх і полацкай ВНУ, каб прадэманстраваць свае таленты.

Цікавую выставу і шыкоўную праграму падрыхтавалі выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты нашай альма-матар. Многім прысутным, безумоўна, больш за ўсё спадабаліся сучасныя мадэлі робатаў, што прадставіў на экспазіцыі факультэт матэматыкі і інфармацыйных тэхналогій нашага ўніверсітэта.

Што датычыцца непасрэдна канцэрта, то ўсе музычныя, харэаграфічныя і літаратурныя нумары машэраўцаў вылучаліся прафесійным выкананнем, канцэптуальнасцю і самабытнасцю. Гонар роднай установы адстойвалі студыя эстраднай песні «Шанс», вакальны ансамбль народнага мужчынскага хору ўніверсітэта, вакальна-інструментальны кавер-гурт «Ч.Т.О.», фальклорны калектыў «Вясёлка», студэнтка ФлФ Марыя Салаўёва, студэнты педагагічнага факультэта Кірыл Макараў і Сяргей Кухарэнка, танцавальныя калектывы «Кантраст», «Be.In.Sane», магістрантка Анастасія Бортнік і інш. Да таго ж у нашых канкурсантаў была вельмі моцная група падтрымкі, якая сваімі апладысментамі падбадзёрвала кожнага выступоўца.

Нашыя хлопцы і дзяўчаты зрабілі ўсё, што маглі. Застаецца толькі чакаць вынікаў. Спадзяёмся, што сярод пераможцаў агляду-конкурсу прагучаць імёны студэнтаў ВДУ імя П.М. Машэрава.

**УЛАСНАЯ ІНФАРМАЦЫЯ.**